Люкевіч, У.П. Жак Раггэ: Актуалізацыя фундаментальных прынцыпаў філасофіі алімпізму на пачатку XXI стагоддзя / У.П. Люкевіч // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. – Серыя 1. – Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. – Навукова-тэарэтычны часопіс. – № 2. – 2020. – С. 55-64.

УДК 796.01:796.032“20”

***Ул.П.Люкевіч***

# ЖАК РАГГЭ: АКТУАЛІЗАЦЫЯ ФУНДАМЕНТАЛЬНЫХ ПРЫНЦЫПАЎ ФІЛАСОФІІ АЛІМПІЗМУ НА ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ

Пачатак новага тысячагоддзя ў сістэме Алімпійскага руху супаў з некалькімі важнейшымі трансфармацыямі дадзенай грамадскай з’явы. Яны датычыліся перш за ўсё актуалізацыі фундаментальных прынцыпаў філасофіі алімпізму, а таксама чарговай змены парадыгмы развіцця спорту. Акрамя таго, Алімпійскі рух у пэўнай ступені падпаў пад магутны ўплыў з боку такіх сацыяльных тэндэнцыяў, як дэмакратызацыя, лібералізацыя, гуманізацыя і шэрагу іншых. Названыя працэсы з неабходнасцю прыцягнулі за сабой новыя праблемы, якія з рознай ступенню паспяховасці павінен быў вырашаць Жак Раггэ ў якасці восьмага прэзідэнта Міжнароднага Алімпійскага камітэту. Асабліва востра яны праявіліся на ўзроўні палітычных, эканамічных, гендэрных і рэлігійных супярэчнасцяў, а таксама ў сферы допінгавых і карупцыйных злоўжыванняў.

## Уводзіны

Пасля заканчэння эпохі кіравання сусветным спортам іспанскага маркіза Хуана Антоніа Самаранча (Juan Antonio Samaranch) восьмым прэзідэнтам Міжнароднага алімпійскага камітэту быў абраны бельгійскі граф Жак Раггэ (Jacques Rogge). Гэта адбылося на 112-й сесіі МАК (IOC, International Olympic Committee) у 2001 годзе, якая праходзіла ў Маскве. У спісе кандыдатаў на гэты пост значыліся таксама Кім Ун Ёнг (Kim Un Yong) з Паўднёвай Карэі, Рычард Паўнд (Richard W. Pound) з Канады, Пал Шмітт (Pal Schmitt) з Венгрыі і Аніта Дэфрантц (Anita L. DeFrantz) са Злучаных Штатаў Амерыкі. У выніку па заканчэнні другога тура галасавання быў названы новы кіраўнік.

Жак Раггэ нарадзіўся ў бельгійскім горадзе Гент (Gent), рэгіён Усходняй Фландрыі. Гэта здарылася 02 траўня 1942 года. Па заканчэнні Генцкага ўніверсітэту атрымаў спецыялізацыю артапедычнага хірурга ў галіне спартыўнай медыцыны. Усё сваё жыццё ён звязаў са спортам, прычым даволі паспяхова займаўся гонкамі пад ветразем, быў 16-ці разовым чэмпіёнам краіны, удзельнічаў у Летніх Алімпійскіх гульнях 1968, 1972 і 1976 гадоў. Таксама гуляў у рэгбі за нацыянальную зборную.

Кар’ера спартыўнага дзеяча пачалася з 1989 года, калі на працягу наступных трох гадоў ён займаў пасаду прэзідэнта Нацыянальнага алімпійскага камітэту Бельгіі. У тым жа 1989 годзе Жак Раггэ ўзначальвае Асацыяцыю Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў (EOC, European Olympic Committees). Далей праз два гады ён уваходзіць у склад МАК, а затым у 1998 годзе – у яго Выканаўчы камітэт. Раггэ стаў першым прэзідэнтам Міжнароднага алімпійскага камітэту, які асабіста прымаў удзел у Алімпіядах. Менавіта яму прыйшлося працаваць на чале МАК у пераломны ў шмат якіх момантах перыяд і вызначаць стратэгію і палітыку гэтай арганізацыі.

Як вядома, Алімпійскія гульні з’яўляюцца самым буйным міжнародным, спартыўным і публічным форумам сучаснаці і выкарыстоўваюцца дзяржавай, прадстаўнікамі бізнэсу і грамадскасцю ў шэрагу вызначаных мэтаў: для дзяржавы гэта – умацаванне ўласнага прэстыжу па-за межамі краіны, кансалідацыі соцыюму, развіцця інфраструктуры рэгіёну правядзення спаборніцтваў з мэтай павелічэння народнага дабрабыту; для прадстаўнікоў бізнэсу гэта – сусветная рэкламная кампанія для іх прадукцыі, а таксама атрыманне прыбыткаў коштам разнастайных акцыяў, нават

ускосных; для грамадскасці гэта – выказванне культурна-этнічнай самабытнасці [гл.: 4, 15].

У той жа самы час згодна з аўтарскай канцэпцыяй узнікнення, фармавання, станаўлення, функцыянавання, развіцця і распаўсюджвання спорту на працягу XX і на пачатку XXI стагоддзяў адбываліся змены парадыгмы ў сутнаснай рэалізацыі гэтага сацыяльнага феномену. Так, калі ад моманту адраджэння алімпійскага руху спорт толькі пачынаў утвараць свае арганізаваныя формы, дамінаваў заклік, які быў выказаны ў дэвізе "Галоўнае не перамога, а ўдзел" (параўнанне са знакамітым афарызмам аднаго з лідэраў апартуністычнага крыла нямецкай сацыял-дэмакратыі і II Інтэрнацыянала Эдуарда Бернштэйна (Eduard Bernstein): рух – усё, канчатковая мэта – нішто), то далей па меры папулярызацыі і актывізацыі гэтай дзейнасці стала актуальным мотта "Altius. Citius. Fortius." ("Хутчэй. Вышэй. Мацней."). Наступная прафесіяналізацыя спорту прымусіла змястоўна памяняць ягоную ўнутраную сутнасць: "Перамога за ўсялякі кошт" стала выглядаць як дамінанта на спаборніцтвах самага рознага ўзроўню. Аднак канец мінулага і пачатак новага тысячагодзя пад уздзеяннем тэндэнцыяў дэмакратызацыі, лібералізацыі, гуманізацыі і шэрагу іншых акалічнасцяў выявіў схільнасць да пераасэнсавання ранейшых прыярытэтаў: "Fair play" у якасці паняцця "чыстай, сумленнай і высакароднай гульні" з поўным правам можа разглядацца ў якасці чарговага дэвізу.

Нягледзячы на тое, што новая рэдакцыя Алімпійскай хартыі, якая дзейнічае ад 26 чэрвеня 2019 года, грунтоўна быццам не змяніла фундаментальныя прынцыпы філасофіі алімпізма, яна стала больш насычаная гуманістычным зместам. На падставе яе палажэнняў алімпізм па ранейшаму ўяўляецца філасофіяй жыцця, што ўзвышае і аб'ядноўвае ў збалансаваным адзінстве вартасці цела, духу і розуму. Алімпізм злучае спорт з культурай і адукацыяй і імкнецца да стварэння такога ладу жыцця, які базуецца на радасці ад намаганняў, каштоўнасці выхавання па ўзорах добрага прыкладу, сацыяльнай адказнасці і павагі да ўсеагульных падставовых этычных прынцыпаў. Актуальнай да гэтага часу застаецца і мэта алімпізму, якая заключаецца ў тым, каб паставіць спорт на службу гарманічнага развіцця чалавецтва, і тым самым садзейнічаць стварэнню мірнага супольніцтва, што клапоціцца пра захаванне сваёй годнасці. Між тым заняткі спортам у дадзеным кантэксце разглядаюцца як адно з неад'емных правоў кожнага індывідуўма, таму ўсе людзі павінны мець доступ да спартыўнай дзейнасці без аніякай дыскрымінацыі, што рэалізуецца праз узаемапаразуменне на падставе сяброўства, салідарнасці і сумленнай гульні. Важным пунктам Алімпійскай хартыі з'яўляецца разуменне таго, што спорт існуе ў межах грамадства і не можа заставацца па-за ягоным уплывам, але тым не менш спартыўныя арганізацыі згодна са спецыфікай сваёй аўтаноміі ў сістэме Алімпійскага руху павінны захоўваць палітычны нейтралітэт. Таксама, - і гэта адмыслова падкрэсліваецца, - ажыццяўленне правоў і свабод павінна забяспечвацца праз адсутнасць усялякай формы дыскрымінацыі, у тым ліку расавай, моўнай, рэлігійнай, палітычнай, па прыкмеце колеру скуры, полавай адметнасці, сексуальнай арыентацыі, плюралістычнасці думак, нацыянальнага ці сацыяльнага паходжання, нараджэння альбо іншага статусу [гл.: 10, 11-12]. Сучасны Алімпійскі рух пільную ўвагу надае маральнай праблематыцы, якая ў працэсе распаўсюджвання ідэяў алімпізма на свеце паўстае ў якасьці аднаго з галоўных духоўных стрыжняў у справе не толькі выхавання моладзі за пасярэдніцтвам спорту, забеспячэння панавання ў гэтай сферы прыярытэту сумленнай барацьбы на спаборніцтвах супраць гвалту ва ўсялякіх яго праявах, а таксама неадступнасці ад палажэнняў Этычнага кодэксу [гл.: 10, 16-17; 8, 4-13]. Місія МАК у той жа час прадугледжвае супрацоўніцтва з разнастайнымі арганізацыямі ў галіне спорта з тым, каб разам садзейнічаць усталяванню міра. Задача падобнага тыпу для Алімпійскага

руху бачыцца ў тым, каб, з аднаго боку, захаваць сваю незалежнасць на ўзроўні аўтанамізацыі спорту, а з другога, - утрымаць палітычны нейтралітэт. Філасофія алімпізму ў самым шырокім разуменні стварае перспектывы для супрацьстаўлення разнастайным формам дыскрымінацыі. Гэта цэлы шэраг пытанняў, якія, напрыклад, датычацца гендэрнай роўнасці, абароны правоў спартоўцаў, барацьбы з допінгам, з карупцыяй, з палітычным ціскам, з камерцыйным злоўжываннем і г.д. [гл.: 10, 16-17]. Менавіта таму адмыслова створаная МАК Камісія па этыцы з’яўляецца сведчаннем таго, наколькі важнай для сучаснага Алімпійскага руху становіцца маральная праблематыка. Камісія па этыцы ў сваю чаргу канцэнтруе сваю працу на выкананні трох наступных функцыяў: па-першае, распрацоўвае і пастаянна абнаўляе сістэму этычных прынцыпаў, у тым ліку і Этычнага кодэксу, а таксама актуалізуе адпаведныя палажэнні, што базуюцца на фундаментальных падставах Алімпійскай хартыі; па-другое, разглядае скаргі, якія датычацца парушэння Этычнага кодэксу, і, калі гэта неабходна, прапануе ўжыванне адпаведных санкцыяў; па-трэцяе, выдае рэкамендацыі МАК адносна дзеяння сістэмы этычных прынцыпаў [гл.: 12]. Такім чынам з вышэй азначанага кола праблемных пытанняў можна зрабіць выснову, з якімі цяжкасцямі глабальнага маштабу неаднаразова сутыкаўся Жак Раггэ за гады свайго прэзідэнцтва ў Міжнародным Алімпійскім камітэце, калі з неабходнасцю тэрмінова патрабавалася вырашаць актуальныя задачы, якія датычыліся пералічанай праблематыкі і асабіста прымаць часам непапулярныя рашэнні.

**Мэта работы**. Вызначыць уплыў прэзідэнта Міжнароднага Алімпійскага камітэту Жака Раггэ на актуалізацыю зместу падставовых накірункаў развіцця філасофіі алімпізму ў варунках глабалізацыйных працесаў функцыянавання сучаснага спорту.

**Метады даследавання.** Пад час падрыхтоўкі дадзенага артыкулу выкарыстоўваліся такія метады даследавання, як назіранне, апісанне, параўнанне, аналіз навуковых і дакументальных крыніцаў, а таксама вывучэнне адкрытай у доступе інтэрнет-інфармацыі.

**Вынікі і абмеркаванне.** Жак Раггэ на пачатку пэўны час устрымліваўся ад канкрэтызацыі праграмы сваёй прэзідэнцкай дзейнасці, аднак два прыярытэтныя накірункі былі ўсё ж такі ім пазначаныя: першы палягаў на тым, каб захаваць і ўмацаваць тую спадчыну, якая напрацавалася намаганнямі Хуана Антоніа Самаранча, і абнаўляць МАК у адпаведнасці са зменамі ў грамадстве; другі, - абараняць Алімпійскі рух ад допінгу, карупцыі і гвалту [гл.: 5, 17]. Трэба адзначыць, што на пераломе тысячагоддзяў Алімпійскі рух пачаў уваходзіць у новую фазу свайго развіцця. Узнікла неабходнасць перагляду змястоўнага напаўнення не толькі фундаментальных прынцыпаў алімпізму, але таксама, напрыклад, коштаў і маштабаў Гульняў, у тым ліку іх праграмы. Асаблівая ўвага звярталася на гарантыю фінансавай незалежнасці. Рэформы ў сістэме дзейнасці МАК на фоне папярэдніх карупцыйных скандалаў павінны былі стаць больш празрыстымі, больш дэмакратычнымі і прадстаўнічымі. Актуальным пытаннем стала вырашэнне стану сацыяльнай і прафесійнай інтэграцыі атлетаў па завяршэнні імі спартыўнай кар’еры. Фундаментальныя алімпійскія прынцыпы прапанавалася напоўніць новым зместам, ці ўвогуле ўтварыць новы дэвіз, які б на пачатку XXI стагоддзя заклікаў да чысціні спорту, салідарнасці і гуманізму [гл.: 5, 17-18].

Прэзідэнт МАК неаднаразова падкрэсліваў, што галоўная задача Алімпійскага руху на сучасным этапе ягонага развіцця бачыцца ў тым, каб абараніць каштоўсці спорту і пазбавіцца тых негатыўных праяваў, што спадарожнічалі яму, а менавіта допінгу, гвалту і расізму. У дадзеным выпадку неабходна было знайсці паразуменне з палітыкамі, кіраўнікамі дзяржаваў і ўрадаў, а таксама атрымаць ад іх падтрымку.

Намаганні ў гэтым накірунку прынеслі свой плён: 13 снежня 2001 года на 56-й сесіі Генеральнай асамблеі Арганізацыі Аб’яднаных Нацыяў была прынятая рэзалюцыя, якая заклікала ўсе краіны захоўваць “алімпійскае перамір’е” з тым, каб забяспечыць праезд і ўдзел спартоўцаў на Зімовыя Алімпійскія гульні ў Солт-Лэйк-Сіці. Пазней падобная рэзалюцыя, якая датычылася Летняй Алімпіяды 2004 года ў Афінах, была прынятая на 58-й сесіі Генеральнай асамблеі ААН 03 лістапада 2003 года. Больш за тое, у дадатак было абвешчана, што 2005 год будзе праходзіць як “Міжнародны год спорту і фізічнай адукацыі” (рэзалюцыя A/RES/58/5), каб надалей садзейнічаць развіццю адукацыі і здароўя на ўсім свеце [гл.: 9].

Пад час кіраўніцтва Жакам Раггэ сусветным алімпійскім рухам былі праведзеныя тры Зімовыя Алімпіяды і тры Летнія. Зімовыя адбыліся ў 2002 годзе ў Солт-Лэйк-Сіці (ЗША), у 2006 – у Турыне (Італія), у 2010 – у Ванкуверы (Канада). Летнія, адпаведна, у 2004 годзе ў Афінах (Грэцыя), у 2008 – у Пекіне (Кітай), у 2012 – у Лондане (Велікабрытанія). Трэба адзначыць, што ніколі ў ранейшай гісторыі Алімпіядаў не назіралася столькі разнастайных скандалаў, якія б звязваліся з гучнымі допінгавымі і крымінальнымі справамі, - і ў выніку адстаўкамі спартыўных функцыянераў, - як у пазначаны перыяд.

Кароткі агляд храналогіі падзеяў на Зімовых і Летніх Алімпіядах у перыяд з 2002 года па 2012 год, калі Жак Раггэ ўзначальваў Міжнародны Алімпійскі камітэт, дае магчымасць упэўніцца ў тым, што барацьба з допінгавым злоўжываннем перайшла на новы якасны ўзровень у чым бачыцца заслуга як самаго прэзідэнта, так і ягонай палітыкі ў гэтым пытанні ў напрамку на шчыльнае ўзаемадзеянне МАК з Нацыянальнымі алімпійскімі камітэтамі ўсіх краінаў, Міжнароднымі федэрацыямі па відах спорту і Сусветным Анты-Допінгавым Агенцтвам (САДА, англ. WADA, World Anti-Doping Agency). Да прыкладу, на гульнях XIX Зімовай Алімпіяды ў Солт-Лэйк-Сіці 2002 года станоўчыя допінг-тэсты былі зафіксаваныя ў расійскіх лыжніц Ларысы Лазуцінай (Larisa Lazutina) і Вольгі Данілавай (Olga Danilova), іспанскага лыжніка нямецкага паходжання Ёхана Мюллегга (Johann Mühlegg), у беларускіх прадстаўнікоў Юліі Паўловіч (шорт-трэк) і Васіля Панкова (хакей). На фоне пашырэння антыдопінгавай кампаніі Зімовыя Алімпійскія гульні ў Турыне-2006 выявілі станоўчы допінг-тэст толькі ў расіянкі Вольгі Пылёвай (Olga Pyleva) у біятлоне. Крыху па іншаму выглядала сітуацыя ў адносінах з супрацьядзеяннем допінгу на Зімовай Алімпіядзе 2010 года ў канадскім горадзе Ванкувер. Па выніках справаздачаў нацыянальных федэрацыяў па відах спорту і арганізацыйных камітэтаў да Гульняў не былі дапушчаныя 30 патэнцыяльных удзельнікаў, у якіх меліся праблемы з допінгам.

Што датычыцца Летніх Алімпійскіх гульняў, то Алімпіяда 2004 года ў Афінах сталася рэкорднай па колькасці дыскваліфікацыяў па прычыне допінгу, іх налічвалася больш за дваццаць. У гэты малапрыемны спіс трапілі нават залатыя медалісты Ірына Каржаненка (Irina Korzhanenko) з Расіі (штурханне ядра) і Роберт Фазекаш (Robert Fazekas) з Венгрыі (кіданне дыску). Гульні Алімпіяды ў Пекіне прайшлі больш спакойна, тым не менш афіцыйна пацьверджанымі сталі станоўчыя вынікі допінг-тэстаў у Марыі Ізабэль Марэна (Maria Isabel Moreno Allué) з Іспаніі (веласіпедны спорт), Кім Ёнг Су (Kim Jong-Su) з Паўночнай Карэі (стральба), До Ці Нган Туёнг (Do Thi Ngan Thuong) з В’етнама (гімнастыка), Фані Халкія (Fani Khalkia) з Грэцыі (лёгкая атлетыка), Людзьмілы Блоньскай (Lyudmila Blonska) з Украіны (лёгкая атлетыка). Акрамя таго, пазьней МАК дыскваліфікаваў яшчэ 16 атлетаў пасля таго, як іх пробы былі пераправераныя. У гэты пералік трапілі дзесяць алімпійскіх прызёраў: тры срэбных і сем бронзавых медалістаў.

Згодна з раней агучанымі Жакам Раггэ заявамі пад час буйнамаштабнай допінг-праграмы Гульняў у Пекіне спартоўцы ў сукупнасці здалі каля 4 тысячаў 770 пробаў на

выяўленне наяўнасці забароненых рэчываў ці прымяненне неналежных тэхналогіяў. Допінг-тэсты ў абавязковым парадку праходзілі пяць лепшых спартоўцаў па выніках спаборніцтваў, а таксама яшчэ двое атлетаў на падставе выпадковай выбаркі.

Лонданская Алімпіяда 2012 года выкрыла станоўчыя вынікі-допінг тэстаў у азербайджанскага штангіста балгарскага паходжання Валянціна Хрыстава (Valentin Hristov), а таксама беларускіх легкаатлетаў Алены Матошкі (кіданне молата) і Аніса Ананенка (бег на 800 м). Таксама прадстаўнікі МАКу паведамілі пра тое, што допінг-тэсты не прайшлі яшчэ 23 атлеты з шасці краінаў, сярод іх беларускі: залатая медалістка Гульняў Надзея Астапчук (штурханне ядра) і бронзавыя прызёры Ірына Кулеша і Марына Шкерманкова (абедзьве – цяжкая атлетыка). Пазьней пераправерка пробаў выявіла наяўнасць забароненых прэпаратаў яшчэ ў шэрагу атлетаў, у тым ліку чарговага беларускага легкаатлета Станіслава Цівончыка (скачкі з шастом).

Кіраўніцтва сусветным спортам у перыяд прэзідэцтва Жака Раггэ вызначылася шэрагам новых тэндэнцыяў. Сярод іх, напрыклад, трэба ўзяць пад увагу такі аспект, як стварэнне большых магчымасцяў для ўдзелу ў працэсе канкурэнцыі гарадоў на месца правядзення Алімпіядаў з боку краінаў, якія падпадаюць пад характарыстыку такіх, што развіваюцца. Пры гэтым Раггэ спадзяваўся на тое, што ў дадзеным выпадку прэтэндэнты на правядзенне Гульняў атрымаюць дзяржаўную падтрымку, а сам МАК пойдзе ў распрацоўках сваёй палітыкі ў будучым на тое, каб паменшыць кошты правядзення спаборніцтваў. Разам з гэтым усім трэба пастаянна мець на ўвазе тое, што алімпізм на сучасным этапе развіцця грамадства паўстае як афіцыйная ідэалагічная дактрына спорта на ўзроўні ягонага светаўспрымання, асабліва калі гэта датычыцца прафесіяналізму [гл.: 1, 57].

Жан Раггэ рашуча скарэктаваў адносіны паміж МАК і міжнароднымі спартыўнымі федэрацыямі, калі выразна падкрэсліў, што Міжнародны Алімпійскі камітэт не падвяргае сумненню іх незалежнасць пад час правядзення сваіх уласных спаборніцтваў, але калі размова будзе весціся наконт правядзення Гульняў, то прыярытэт будзе заставацца за рашэннямі Алімпійскага камітэту. Прэзідэнта ў дадзеным выпадку можна было б абвінаваціць у аўтарытарных амбіцыях, але з іншага боку, - як і ў прыняцці шэрагу іншых рашэнняў, - ён быў вымушаны аператыўна рэагаваць на тыя сітуацыі, якія час ад часу нечакана ўзнікалі і патрабавалі неадкладнага ўмяшальніцтва. Жак Раггэ правёў арганізацыйныя змяненні ў структуры адміністрацыі МАК: была ўведзеная пасада амбасадара Генеральнага дырэктара па Алімпійскіх гульнях. Яшчэ адна навацыя датычылася спрашчэння зместу Алімпійскай хартыі з тым, каб зрабіць яе тэкст больш зразумелым. Асабліва кардынальных пераменаў у дзейнасці МАК чакаць было цяжка з тае прычыны, што ў цэлым функцыянаванне гэтай арганізацыі грунтавалася, з аднаго боку, на папярэдніх гістарычных традыцыях алімпізіу, а з другога, - на напрацоўках Хуана Антоніа Самаранча, якія Раггэ атрамаў у спадчыну [гл.: 5, 18-19].

Па сведчаннях назіральнікаў, Жак Раггэ дэманстраваў высокія дыпламатычныя здольнасці і ўменні пазбягаць канфрантацыяў. Ён займеў рэпутацыю непадкупнага службоўца, які быў недатычны да карупцыйных скандалаў. Ад пачатку сваёй дзейнасці на чале МАК ён выказваў асабістую рашучасць у адносінах да пераадолення галоўных пагрозаў, якія неабходна было ліквідаваць у першую чаргу, а менавіта допінг, гвалт і карупцыю [гл.: 3]. Стратэгічна важным крокам у перспектыве далейшай дзейнасці МАК сталася падпісанне дамовы з ЮНЭСКА (UNESCO) аб супрацоўніцтве ў намаганнях барацьбы з допінгам.

На думку А.Б.Ратнера, пачатак дзейнасці Ж.Раггэ, - а па вялікім рахунку і на працягу ўсёй яго кадэнцыі, - можа вызначыцца ў шэрагу такіх накірункаў для рэалізацыі, як: - захаванне пераемства ў стратэгіі развіцця Алімпійскага руху на

падставе палажэнняў, якія раней былі распрацаваныя ягоным папярэднікам Хуанам Антоніа Самаранчам, зразумела, з улікам асабістага бачання актуальных праблемаў; - упэўненасць у тым, што на працягу бліжэйшых 15-20 гадоў Алімпійскія гульні захаваюць статус галоўнай спартыўнай падзеі на свеце; - адсутнасць занепакоенасці ў фінансавай забяспечанасці міжнароднага Алімпійскага руху; - стабільнасць алімпійскай праграмы; - актывізацыя барацьбы з допінгам, гвалтам, расізмам і іншымі непажаданымі тэндэнцыямі [гл.: 5, 20].

Як пазначаюць А.А.Сучылін і Л.І.Сталярчук (Сучилин, А.А., Столярчук, Л.И.), увогуле Жак Раггэ практычна дзейнічаў згодна з той стратэгіяй, якая раней была распрацавана Хуанам Антоніа Самаранчам. Гэта перад усім датычылася канцэпцыі правядзення Алімпійскіх гульняў, аптымізацыі лічбы атлетаў на спаборніцтвах, імкнення да павелічэння колькасці краінаў-удзельніцаў. Але адначасова яму прыйшлося прыкласці дадатковыя намаганні ў барацьбе з допінгам [гл.: 7, 227], што выявілася ва ўвядзенні абавязковай сістэмы допінг-кантролю, павелічэнні колькасці спецыялізаваных лабараторыяў абсталяваных найноўшай апаратурай, супрацоўніцтвам са спецыялістамі высокага класу [гл.: 6, 70].

Па вялікім рахунку Міжнародны Алімпійскі камітэт у сваёй дзейнасці перад усім бярэ пад увагу тры наступныя каштоўнасці: па-першае, гэта самаўдасканаленне, якое праяўляецца ў тым, каб дэманстраваць лепшае ўвасабленне на пляцоўцы для гульні ці ўвогуле ў жыцці, імкненне да дасягнення асабістых мэтаў з рашучасцю ў намаганнях; па-другое, гэта сяброўства на ўзроўні ўзаемапаразумення паміж людзьмі, якое мае самае непасрэднае дачыненне да пабудовы мірнага і больш дасканалага свету праз пераадоленне палітычных, эканамічных, гендэрных, расавых, рэлігійных і іншых супярэчнасцяў; па-трэцяе, гэта павага, што паўстае не толькі як этычны прынцып, але мае адносіны як да самаго спартоўца як такога і ягонага цела, так і да іншых суб’ектаў спартыўнай дзейнасці, да правілаў спаборніцтваў, да навакольнага асяроддзя, да сумленнай гульні, да адмаўлення ад допінгу [гл.: 11].

Трэба звярнуць увагу і на тое, што філасофія алімпізму пад час прэзідэнцтва Жака Раггэ набывала новыя рысы і характарыстыкі, што выявіліся ў шэрагу момантаў акцэнтацыі пытанняў, якія адпавядалі новай якасьці грамадскага жыцця. Напрыклад, нашмат больш увагі надавалася захаванню роўных правоў на ўдзел у Алімпійскім руху для жанчынаў і мужчынаў, багатых і бедных, для прадстаўнікоў развітых дзяржаў і тых краінаў, якія развіваюцца. Падкрэслівалася, што спорт ва ўзаемадзейнасці з адукацыяй і культурай садзейнічаюць гарманічнаму і збалансаванаму развіццю цела і розуму, а гэта ў далейшым вядзе да пашырэння вызначанай тэндэнцыі на ўсе сацыяльныя групы. Асабліва гэта мае вялікае значэнне ў змаганні з глабальнай праблемай нарастання недахопу фізічнай актыўнасці сярод моладзі, у сувязі з чым МАК нават распрацаваў новую моладзевую стратэгію.

З увагі на глабальны кантэкст спорту і яго ролю на свеце Міжнародны Алімпійскі камітэт прыняў рашэнне адрадзіць традыцыю алімпійскага перамір’я з тым, каб абараніць наколькі магчыма інтарэсы спартоўцаў і заахвоціць пошук дыпламатычных вырашэнняў вайсковых канфліктаў. У выніку ў 2000 годзе была створаная Міжнародная Фундацыя Алімпійскага перамір’я (IOTF, International Olympic Truce Foundation). Асаблівая ўвага ад пачатку XXI стагоддзя стала надавацца абароне здароўя спартоўцаў, што непасрэдна звязваецца з павелічэннем выпадкаў злоўжывання допінгам. Сусветнае антыдопінгавае агенцтва прыкладае вялікія намаганні ў вырашэнні гэтай праблемы, але пакуль маюцца толькі адносныя поспехі. Паралельна з допінгавай пагрозай узнікае новая небяспечная для алімпізму і спорту ў цэлым праблема - ашуканства, што звязанае са стаўкамі на выніку спартыўных спаборніцтваў. [гл.: 11].

**Заключэнне.** Прэзідэнцтва Жака Раггэ на чале Міжнароднага алімпійскага камітэту дазваляе вызначыць некалькі тэндэнцыяў, якія могуць характарызавацца як гуманістычныя ў іх акцэнтацыі на маральную праблематыку. Сапраўды, можна заўважыць, на пачатку XXI стагоддзя Алімпійскі рух пільную ўвагу надае этычным прынцыпам, пра што сведчыць новая якасць фундаментальных палажэнняў Алімпійскай хартыі, якая знаходзіць сваё ўвасабленне ў практыцы спартыўнай дзейнасці. Паняцце "сумленнай і высакароднай барацьбы на спаборніцтвах", - Fair play, - дае магчымасць пераасэнсаваць месца спартоўца, - перад усім чалавека, - у сістэме сацыяльных адносінаў, а калі ахапіць гэтую сферу шырэй, то яна ўключае ў сябе ўсіх тых асобаў, якія так ці інакш звязаныя са спортам. На сучасным этапе функцыянавання грамадства спорт у сілу сваёй татальнасці мае дачыненне і ўзаемадзейнічае з іншымі глабальнымі феноменамі. Таму, напрыклад, тэндэнцыі дэмакратызацыі, лібералізацыі, эмансіпацыі і іншыя проста не маглі застацца па-за сферай ягонага ўплыву. Сусветная інфармацыйная прастора ў варунках дамінавання сродкаў масавай камунікацыі open society стварыла магчымасці практычна неабмежаванага доступу для абмеркавання палітычных, эканамічных, гендэрных, расавых, рэлігійных і іншых супярэчнасцяў, а таксама правоў чалавека, - спартоўца, - як да самаго сябе, так і да свайго асабістага цела, асабліва, калі размова ідзе пра допінгавую праблематыку.

Жак Раггэ шмат намаганняў зрабіў у справе пашырэння і распаўсюджвання Алімпійскага руху. Ён актыўна садзейнічаў таму, што ўпершыню ў гісторыі права на правядзенне Алімпійскіх гульняў атрымаў горад з Лацінскай Амерыкі, а менавіта Рыа-дэ-Жанэйра. Гэта стала вынікам паслядоўнай палітыкі прэзідэнта МАК, які неаднаразова падкрэсліваў, што розніцы ў магчымасці прыняць Гульні не павінна існаваць у адносна развітых краінаў і тых, якія развіваюцца.

Аднак неабходна заўважыць, што менавіта ў перыяд кіравання Жака Раггэ пачалася чарада гучных допінгавых алімпійскіх скандалаў. Аднымі з першых выпадкаў ужывання забароненых рэчываў сталі абвінавачванні да іспанскага лыжніка нямецкага паходжання Ёхана Мюлегга і жаночай лыжнай зборнай каманды Расіі ў Солт-Лэйк-Сіці пад час Зімовай Алімпіяды 2002 года. Увогуле, праблема допінгу ў часы кіравання Раггэ Міжнародным Алімпійскім камітэтам сталася найбольш актуальнай. Колькасць допінг-тэстаў намнога узрасла. Справа дайшла да таго, што на Зімовай Алімпіядзе ў Турыне 2006 года МАК разам з САДА скарысталіся дапамогай мясцовай паліцыі, каб прымусіць спартоўцаў здаваць тэсты не толькі непасрэдна перад спаборніцтвамі, але таксама пад час трэніровак і нават у вольны час. Прэзідэнт МАК асабіста паўплываў на тое, каб атлеты, якіх злавілі на допінгавым злоўжыванні, не дапускаліся да наступных Алімпійскіх гульняў. У гэтым пытанні ён прытрымліваўся даволі паслядоўнай пазіцыі і спрабаваў нават, - праўда без асаблівага поспеху, - выйсці за межы сваіх паўнамоцтваў, калі выявіў жаданне зрабіць ціск на футбольных функцыянераў з УЕФА (Саюз еўрапейскіх футбольных асацыяцыяў, англ. UEFA, Union of European Football Associations) і ФІФА (Міжнародная федэрацыя футбольных асацыяцыяў, фран. FIFA, Fédération Internationale de Football Association). Жак Раггэ таксама надаваў пільную ўвагу пытанням судзейства. Пад яго націскам ІСУ (Міжнародны саюз канькабежцаў; англ. ISU, International Skating Union) прыняў рашэнне аб змяненні сістэмы ацэнак у фігурным катанні. Акрамя таго, у шэрагу відаў спорту, - напрыклад, фехтаванне, гімнастыка, - было дазволена ў спрэчных сітуацыях выкарыстоўваць сістэму відэапаўтораў. Разам з тым ён цвяроза ацэньваў далейшыя тэндэнцыі развіцця Алімпійскага руху і добра сабе ўсведамляў, што неабходна захаваць кампактнасць правядзення Гульняў пры 28-мі відах спорту з магчымасцю іх ратацыі і 10,5 тыс. атлетаў, каб такім чынам пазбегнуць залішняга цяжару ў арганізацыі Алімпіядаў для гарадоў-гаспадароў. Самую разнастайную дапамогу ад МАК, - у тым ліку і фінансавую,

- пры ягоным актыўным удзеле атрымалі краіны, якія адносяцца да катэгорыі тых, што развіваюцца. Алімпіяды сталі адбывацца на іншых кантынентах, а не толькі ў Еўропе. Менавіта з удзелам Жака Раггэ быў распрацаваны і далей рэалізаваны праект Юнацкіх Алімпійскіх гульняў, пра які ў свой час задумваўся яшчэ Хуан Антоніа Самаранч са сваёй пілотнай спробай юнацкіх гульняў у Маскве у 1998 годзе. Не засталася па-за абсягам дзейнасці МАК і экалагічная праблематыка. Асабліва трэба падкрэсліць яшчэ і тое, што за гэты час неймаверна павялічылася фінансавая стабільнасць Алімпійскага руху, якая за прэзідэнтцвам Жака Раггэ ўзрасла ў чатыры разы. Свае прыбыткі МАК накіроўвае не толькі на падтрымку дзейнасці Нацыянальных Алімпійскіх камітэтаў, але таксама дапамагае непасрэдна алімпійцам. Увогуле Жак Раггэ увесь свой тэрмін кіраўніцтва МАКам прытрымліваўся збалансіраванай палітыкі, якая, па вялікім рахунку, была накіраваная на пазбаўленне істотнай розніцы паміж развітымі краінамі і тымі, якія развіваюцца; на дасягненне ў спорце роўных правоў мужчынаў і жанчынаў; на тое, каб зрабіць спорт узорам для ўсіх [гл. больш падрабязна: 2].

У 1992 годзе кароль Бельгіі Бадуэн (Baudouin) узвёў Жака Раггэ да шляхецкага рангу, а ў 2002 годзе кароль Альберт II (Albert II van België) дараваў яму тытул графа.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Визитей, Н.Н., Манолаки, В.Г. Спорт и идея олимпизма (философско-культурологический анализ проблемы) / Н.Н. Визитей, В.Г. Манолаки // Наука и спорт: современные тенденции. – 2013. – № 1. – С. 57-68.

2. Жак Рогге: восемь лет кнута и пряника [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.championat.com/other/article-3084071-zhak-rogge-vosem-let-knuta-i-prjanika.html. – Дата доступа: 15.04.2020.

3. Жак Рогге Jacques Rogge Биография [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.peoples.ru/sport/figure/jacques_rogge/. – Дата доступа: 09.09.2019.

4. Нуреев, Р.М., Маркин, Е.В. Эти разные Олимпийские игры / Р.М. Нуреев, Е.В. Маркин // Terra economicus (Экономический вестник Ростовского государственного университета). – 2009. – Том 7. – № 3. – С. 10-28.

5. Ратнер, А.Б. Международное Олимпийское движение в начале XXI века: перспективы развития / А.Б. Ратнер // Вестник спортивной науки. – 2004. – № 1. – С. 17-20.

6. Сучилин, А.А. Идеалы Пьера де Кубертена и современное Олимпийское движение / А.А. Сучилин // Известия Волгоградского государственного педагогического университета. – 2012. – Том 4 (68). – С. 68-71.

7. Сучилин, А.А., Столярчук, Л.И. Трансформация идеалов и гендерных отношений в Олимпийском движении / А.А. Сучилин, Л.И. Столярчук // Педагогико-психологические и медико-биологические проблемы физической культуры и спорта. – 2016. – № 1 (38). – С. 220-230.

8. Ethics / International Olympic Committee / IOC Ethics Commission. – Lausanne / Switzerland: International Olympic Committee, 2020. – 117 p.

9. International Year for Sport and Physical Education (2005) [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.unis.unvienna.org/unis/en/activities/year_of_sport.html. – Date of access: 11.05.2020.

10. Olympic Charter (in force as from 26 June 2019) / International Olympic Committee. – Lausanne/ Switzerland: International Olympic Committee, 2019. – 106 p.

11. Olympism and the Olympic Movement [Electronic resource]. – Mode of access: https://stillmed.olympic.org/media/Document%20Library/OlympicOrg/Documents/Document-Set-Teachers-The-Main-Olympic-Topics/Olympism-and-the-Olympic-Movement.pdf. – Date of access: 14.05.2020.

12. The International Olympic Committee / Ethics Commission [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.olympic.org/ethics-commission. – Date of access: 20.05.2020.

The beginning of a new millennium in the system of the Olympic movement coincided with several important transformations of this social phenomenon. They touched primarily on the updating of the fundamental principles of the philosophy of Olympism, as well as the next paradigm shift in the development of sports. In addition, the Olympic movement was to some extent subjected to powerful influence from such social trends as democratization, liberalization, humanization, and a number of others. These processes necessarily entailed new problems that, with varying degrees of success, Jacques Rogge had to solve as the eighth president of the International Olympic Committee. They were especially acute at the level of political, economic, gender and religious contradictions, as well as in the field of doping and corruption abuse.

***Lukievič U.P.*** **Jacques Rogge: Updating the fundamental principles of the philosophy of Olympism at the beginning of the XXI century**